# Па перспектыўную прафесію — у магілёўскія УВА

**Самае надзённае пытанне для школьнікаў-выпускнікоў — набыццё прафесіі. Маладыя людзі імкнуцца атрымаць перспектыўную спецыяльнасць, прэстыжную ў грамадстве, запатрабаваную на рынку працы. І магілёўскія ўніверсітэты сёння прапануюць шырокі пералік прафесій на любы густ. У гэтым пераконвалі прэзентацыйныя мерапрыемствы рэгіянальных УВА, якія адбыліся ў межах калегіі ўпраўлення адукацыі аблвыканкама.**

Начальнікі раённых аддзелаў адукацыі, спорту і турызму, кіраўнікі навучальных устаноў абласнога падпарадкавання, моладзь змаглі азнаёміцца з матэрыяльнай базай і асаблівасцямі вучэбнага працэсу ў трох найбуйнейшых універсітэтах абласнога цэнтра.

Так, у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова рыхтуюць не толькі высакакласных педагогаў, але і спецыялістаў для іншых галін: журналістаў, эканамістаў, юрыстаў, праграмістаў, гісторыкаў, псіхолагаў, харэографаў, сацыяльных работнікаў. Універсітэт дынамічна развіваецца, што станоўча адбіваецца на колькасці яго студэнтаў.

Напрыклад, цяпер тут вучыцца звыш 5 тысяч маладых людзей. Увогуле, МДУ сёння — гэта 7 факультэтаў, 2 каледжы, Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, аспірантура, дактарантура, уласны выдавецкі цэнтр. Падрыхтоўка кадраў вядзецца па 28 спецыяльнасцях сіламі звыш 400 выкладчыкаў.

Адметнасцю ўніверсітэта з'яўляецца функцыянаванне на яго базе рэгіянальнага кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Яго наяўнасць робіць установу галоўным навукова-метадычным цэнтрам сістэмы адукацыі вобласці. Як адзначыў рэктар Дзяніс Дук, гэтая функцыя ажыццяўляецца па трох асноўных напрамках: забеспячэнне спецыялістамі эканомікі і сацыяльнай сферы рэгіёна, навуковае і метадычнае суправаджэнне адукацыі, работа непасрэдна з навучальнымі ўстановамі.

— У склад кластара зараз уваходзяць 38 агульнаадукацыйных устаноў і два сярэднія спецыяльныя каледжы. Актыўнае ўзаемадзеянне наладжана з кожным з гэтых суб'ектаў. У школах намі створаны 19 профільных педагагічных класаў і 34 педагагічныя групы. Выкладчыкі ўніверсітэта адказваюць за метадычнае суправаджэнне гэтых класаў, у асобных школах выкладаюць для вучняў факультатыўны курс "Уводзіны ў педагагічную прафесію". Адной з інавацыйных пляцовак кластара з'яўляецца Цэнтр развіцця філалагічнай адоранасці, які не толькі падтрымлівае таленавітых навучэнцаў, але і метадычна дапамагае настаўнікам, — расказаў Дзяніс Уладзіміравіч.

Ва УВА пільна сочаць за рынкам працы, грунтуючыся на гэтым фарміруюць пералік спецыяльнасцей, таму набытая тут прафесія будзе актуальнай і запатрабаванай. Працуюць і над умацаваннем практыкаарыентаванасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Яна рэалізуецца праз стварэнне філіялаў кафедраў універсітэта. На сённяшні дзень толькі для будучых педагогаў такія дзейнічаюць на базе дзесяці ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і спецыяльнай адукацыі.

Пастаянна актуалізаваць пералік спецыяльнасцей стараюцца і ў Беларуска-Расійскім універсітэце. Напрыклад, за апошні час тут адкрылі новыя кваліфікацыі з упорам на інавацыйную эканоміку. Па беларускіх і расійскіх адукацыйных стандартах тут можна навучыцца эканомікі і арганізацыі вытворчасці, транспартнай лагістыцы, праграмнай інжынерыі, інаватыцы, біятэхнічным тэхналогіям, мехатроніцы і робататэхніцы.

Характэрна, што вучэбны працэс ва ўніверсітэце знаходзіцца ў інавацыйным рэжыме. Прафесарска-выкладчыцкі склад пастаянна працуе над паляпшэннем якасці навучання, адукацыйнага асяроддзя, укараненнем адукацыйных тэхналогій і даследчых методык новага пакалення. Сёння ва УВА развіта дыстанцыйнае навучанне, існуе модульна-рэйтынгавая сістэма кантролю ведаў, інтэрнэт-тэсціраванне студэнтаў па профільных дысцыплінах у рэжыме анлайн.

Значную ўвагу ў БРУ таксама ўдзяляюць практыкаарыентаванасці навучання. На вядучых прадпрыемствах вобласці кіраўніцтвам універсітэта ствараюцца вучэбна-навукова-вытворчыя аб'яднанні. Непасрэдна на вытворчасці праводзяцца лабараторныя і практычныя заняткі. Гэта дазваляе пазбегнуць акадэмічнай адарванасці студэнтаў ад рэальных вытворчых працэсаў і зрабіць іх прафесійную падрыхтоўку больш якаснай.

Яшчэ адна адметнасць УВА — функцыянаванне на прынцыпах адзінства адукацыі і навукі. Навуковая работа ў БРУ з'яўляецца найважнейшым складнікам дзейнасці. Яна ажыццяўляецца ў рамках дзяржаўных праграм фундаментальных і прыкладных даследаванняў у гаспадарча-дагаворнай форме. Да навукі тут далучаны выкладчыкі, студэнты, аспіранты. Пэўным адкрыццям вельмі спрыяе выдатная матэрыяльна-тэхнічная база. Ва ўніверсітэце функцыянуюць спецыялізаваны цэнтр тэхнічнага навучання, у якім усталяваны сучасныя станкі з лічбавым праграмным кіраваннем, цэнтр эксплуатацыі і экспертызы аб'ектаў павышанай небяспекі, цэнтр сертыфікацыі і выпрабаванняў, спецыялізаваны інжынірынгавы цэнтр, шматлікія навукова-тэхнічныя лабараторыі. Нядзіўна, што большасць навуковых распрацовак з'яўляюцца не толькі на паперы, а актыўна ўкараняюцца на беларускіх і замежных прадпрыемствах.

На інтэграцыю адукацыі, навукі і вытворчасці арыентуюцца і ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце харчавання. УВА — адна з нямногіх, дзе вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў для харчовай, перапрацоўчай і хімічнай галін прамысловасці. Універсітэт — буйны вучэбны і даследчы цэнтр, дзе рыхтуюць высокакваліфікаваныя кадры, а таксама развіваюцца навуковыя школы, якія атрымалі прызнанне ў нашай краіне і за яе межамі. Навуковыя распрацоўкі мясцовых выкладчыкаў і студэнтаў не толькі перыядычна ўкараняюцца на прадпрыемствах. З нядаўняга часу вытворчасць пэўных прадуктаў харчавання наладжана непасрэдна ва ўстанове.

Акрамя гэтага, зараз тут актыўна працуюць над фарміраваннем інавацыйных падыходаў да тэхналагічнай адукацыі ў рамках рэспубліканскага вучэбна-навукова-вытворчага тэхналагічнага кластара. Праз кластар будзе наладжана супрацоўніцтва трох тэхналагічных універсітэтаў рэспублікі. Калі дакладней — інтэграцыя рэсурсаў, мерапрыемствы па абмене вопытам і вынікамі работы ў навукова-тэхнічнай і адукацыйнай сферах, ажыццяўленне фундаментальных і прыкладных даследаванняў, патэнтнай дзейнасці і трансферу тэхналогій, рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі і дадатковай адукацыі дарослых.

Наогул, прэзентацыі ўсіх трох універсітэтаў праходзілі інфармацыйна насычана і цікава. Такая наглядная дэманстрацыя адукацыйных магчымасцей УВА дасць своеасаблівы штуршок іх супрацоўніцтву з іншымі навучальнымі ўстановамі, што павінна станоўча паўплываць на эфектыўнасць функцыянавання сістэмы адукацыі рэгіёна.